Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

Пасадзіце кусты таматаў праз адзін з капустай. Пах таматаў перабівае капусны пах і матылі на капусту не садзяцца. Ды і кусты таматаў добра прыцяняюць яе ад сонца.

РАЗМНАЖЭННЕ БЭЗУ ЧАРАНКАМІ

Позняй вясной і летам бэз можна лёгка размножыць у хатніх умовах, выкарыстоўваючы зялёныя чаранкі. З дапамогай гэтага спосабу можна ўкараніць бэз нават з букета. Пры ўмове, што яго зрэзалі не пазней за суткі таму.

Варта ўлічыць, што бэз — расліна, якая цяжка ўкараняецца. Таму для паспяховага размнажэння важна выконваць пэўныя ўмовы:

1. Не прапусціць тэрмін нарыхтоўкі чаранкоў. Зялёныя галінкі бэзу зразаюць падчас цвіцення або адразу ж пасля яго, бо адраўнелыя чаранкі не ўкараняюцца. І лепш за ўсё рабіць гэта раніцай.

2. Чаранкі трэба вырэзаць з сярэдзіны кроны маладых кустоў (узростам да 6 гадоў) і з сярэдняй часткі парасткаў. Пры гэтым чаранок абавязкова павінен быць зялёным, даўжынёй 10—15 см і на ім абавязкова павінны быць 2-3 пупышкі. Парасткі, якія ідуць ад тоўстых дрэў, непрыдатныя.

3. Аптымальная тэмпература для ўкаранення чаранкоў — 22—25 °С, а вільготнасць — 85—95%.

Падрыхтоўка зялёных чаранкоў

1. З дапамогай вострага секатара з ніжняга вузла чаранка выдаліце лісце.

2. Максімальна блізка да гэтага вузла, не пакідаючы пянька, зрабіце косы зрэз. Улічыце: чаранкі са зрэзамі ў міжвузеллі не ўкараняюцца.

Да зрэзу чаранка пастаўцеся вельмі ўважліва: у бэзу карані растуць толькі ў вобласці ніжняга вузла. І няправільна зроблены зрэз прывядзе да таго, што расліны не ўкараняцца.

3. Усё лісце, якое засталося на чаранку, пакараціце напалову.

4. Над верхнім вузлом, адступіўшы 1 см, зрэжце верхавіну парастка. Пры гэтым зрэз павінен быць роўным.

5. Падрыхтаваныя чаранкі змясціце ў раствор са стымулятарам кораненўтварэння на 14—17 гадзін. Тэмпература вады павінна быць 18—20 °С.

Укараненне чаранкоў

1. Лепш за ўсё ўкараняць чаранкі ў сумесі торфу (2 часткі) і буйназярністага перліту (1 частка). Пясок дадаваць непажадана.

2. У прыдатную ёмістасць насыпце невялікі пласт дрэнажу, а на яго — прыгатаваную сумесь пластом 10 см. Пасля — пласт (3 см) буйназярністага пяску — пажадана выкарыстоўваць рачны.

3. Добра паліце глебу.

4. У вільготным пяску з дапамогай тонкай палачкі зрабіце невялікую лунку і змясціце ў яе чаранок на глыбіню 1 см. Прасачыце, каб зрэз чаранка знаходзіўся ў пяску, але не датыкаўся торфасумесі. Астатнія чаранкі пасадзіце так, каб яны не чапляліся адзін за аднаго лісцем.

5. Чаранкі апырскайце з пульверызатара вадой пакаёвай тэмпературы.

6. Ёмістасць накрыйце празрыстым вечкам з пластыку (можна выкарыстоўваць абрэзаную поліэтыленавую бутэльку) або плёнкай і змясціце ў паўцень.

Догляд чаранкоў

Для падтрымання вільготнасці штодня апырсквайце чаранкі вадой. Пясок не павінен перасыхаць. Каб на лісці не ўтваралася цвіль, раз на тыдзень апырсквайце іх светла-ружовым растворам марганцоўкі.

Пасля з'яўлення каранёў чаранкі пачынайце ветрыць.

Звычайна карані з'яўляюцца праз 30—60 дзён. Да восені чаранкі павінны расці ў чараночніку, а ў верасні высадзіце іх на градку для дагадоўвання, размешчаную ў добра асветленым месцы з лёгкай, урадлівай глебай нейтральнай кіслотнасці, пасля чаго паліце. Пры гэтым адлегласць паміж чаранкамі павінна быць каля 30 см.

Калі восенню лісты на чаранках пацямнелі — не хвалюйцеся. Важна, каб не пацярпелі пупышкі і карані. На зіму атуліце чаранкі спанбондам або лапнікам. Вясной з надыходам цёплага надвор'я сховішча зніміце. Праз 1-2 гады саджанец бэзу можна будзе перасадзіць на пастаяннае месца. І ўжо праз 2—3 гады расліна зацвіце.

Варта ўлічыць, што ў хатніх умовах зялёныя чаранкі, як правіла, укараняюцца толькі ў 50—70% выпадкаў. Таму нарыхтоўвайце некалькі галінак бэзу.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.53	21.20	16.27
Віцебск —	4.36	21.17	16.41
Магілёў —	4.43	21.10	16.27
Гомель —	4.48	20.59	16.11
Гродна —	5.10	21.34	16.24
Брэст —	5.19	21.27	16.08

Месяц

Маладзік 25 мая.
Месяц у сузор'і Цяльца.

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Іосіфа, Кірылы, Мяфодзія, Макея, Нікадзіма, Расціслава, Сафрона.*
К. *Жанны, Зузаны, Магдалены, Марыі, Вінцэнта.*

Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

24 МАЯ

Дзень славянскага пісьменства і культуры. Адзначаецца ў гонар славянскіх асветнікаў і прапаведнікаў хрысціянства Кірылы і Мяфодзія, якія далі славянскаму свету кірыліцу (863) і якія заклалі падмурак рускай і іншых славянскіх літаратур.

1113 год — меркаваная дата нараджэння (г. Тураў) Кірылы Тураўскага, вядомага ўсходнеславянскага царкоўнага дзеяча, багаслова. Быў вельмі адукаваным чалавекам свайго часу. Рана пастрыгся ў манахі. З'яўляючыся тураўскім епіскапам, праславіўся як прапаведнік. Нашы далёкія продкі называлі Кірылу Тураўскага «Златоуст, паче всех воссиявший нам на Руси». Да нас дайшло 70 яго твораў. Існуе гіпотэза, што знакамітае «Слова пра паход Ігараў» напісана менавіта Кірылам Тураўскім. У канцы 1170-х гг. адышоў ад спраў і прыняў вялікую схіму. Апошнія гады жыцця правёў у Барысаглебскім епіскапскім манастыры. Памёр пасля 1190 года. У 1984 годзе прылічаны да Сабору беларускіх святых.

1743 год — нарадзіўся Жан-Поль Марат, палітычны дзеяч эпохі Вялікай французскай рэвалюцыі, урач, радыкальны журналіст, адзін з лідараў якабінцаў.

1904 год — нарадзіўся (в. Пясочнае, цяпер у Капыльскім раёне) Адам Русак, беларускі паэт, заслужаны дзеяч культуры БССР. Працаваў салістам аркестра Ленінградскага Малога опернага тэатра, Белдзяржфілармоніі. Першы верш «Мая песня» апублікаваны 27 мая 1927 года ў часопісе «Чырвоны сейбіт». Больш рэгулярна пачаў друкавацца з 1932 года ў часопісах «Полымя рэвалюцыі», газетах «Звязда», «Літаратура і мастацтва».

У 1940 годзе быў падрыхтаваны да друку першы яго зборнік «На родных палетках», але вайна перашкодзіла яго своечасоваму выданню. Ён убачыў свет толькі ў 1946 г. Аўтар кнігі паэзіі «Песні і вершы», «Закрасуйся, Нёман», «Засцілайце сталы», кнігі вершаў для дзяцей «У Буслаўцы», «Добра ведаю ўрок». Найбольшую вядомасць атрымала песня «Бывайце здаровы» (1936, музыка — І. Любан). Сярод яе першых выканаўцаў — Ларыса Александроўская. Яна была выканана таксама ў фільме «Канцэрт — фронту» Леанідам Уцёсавым з ваеннымі куплетамі, «Лясной песняй», «Толькі з табою» і інш. Памёр у 1987 годзе.

1905 год — нарадзіўся Міхаіл Аляксандравіч Шолахаў, рускі савецкі пісьменнік, грамадскі дзеяч, акадэмік АН СССР, лаўрэат Нобелеўскай прэміі па літаратуры (1965 год), двойчы Герой Сацыялістычнай Працы. Аўтар раманаў «Узнятая цаліна», «Ціхі Дон», «Яны змагаліся за Радзіму» і інш. Многія творы пісьменніка экранізаваны. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР і Ленінскай прэміі.

1997 год — Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Барыс Ельцын і Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка падпісалі Статут Саюза Беларусі і Расіі, дакумент, які вызначае асноўныя параметры інтэграцыйнага працэсу дзвюх краін.

Было сказана

Кузьма ЧОРНЫ, пісьменнік, публіцыст:
«Калі ты — камень, то трымайся дна».

УСМІХНЕМСЯ

А хто будзе скардзіцца на спёку ў чэрвені, атрымае лыжамі па пысе.

— Наш дзядуля пяць разоў перапісваў завяшчанне.

— А няма чаго было з настаўніцай беларускай мовы жаніцца...

Цяпер пучок зялёнай цыбулі каштуе столькі, што з ім будзе не сорамна прыйсці да дзяўчыны на спатканне.

Размова з жонкай.

— У нашай сям'і павінен хоць хтосьці працаваць!

— А што, халадзільнік не лічыцца?

Кажуць, жанчыны — слабы пол. Ды я вас умаляю... Ні адзін мужык не зможа з пахмелля зварыць боршч і прыбраць кватэру!



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1869. Нумар падпісаны ў 19.30 23 мая 2017 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12